**НАЦЫЯНАЛЬНЫ АРХІЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА АРХІВІСТАЎ**

Інфармацыйны ліст

**21 мая 2026 г.** у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (пр-т Незалежнасці, 116, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь) адбудзецца **V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Архіўны дыялог: Роля жанчын у навейшай гісторыі Беларусі»**. Дадзеная міжнародная камунікацыйная пляцоўка адкрывае магчымасці для дыялогу і плённага абмену вопытам паміж архівістамі і даследчыкамі, прадстаўнікамі органаў дзяржаўнай улады, навукі, сфер адукацыі і культуры, грамадскіх аб’яднанняў.

**Праблемнае поле канферэнцыі**

- Крыніцазнаўчы патэнцыял архіўных дакументаў па навейшай гісторыі Беларусі і дзяржаў постсавецкай прасторы.
- Архіўная справа на Беларусі ў ХХ—ХХІ стст.: гісторыя, методыка, практыка.
- Справаводства: тэорыя і практыка.
- Архіўныя дакументы і гістарыяграфія падзей Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі: да 85-годдзя пачатку вайны.
- Жанчыны ў партызанскім і падпольным руху, на фронце і ў тыле.
- Роля жанчын у захаванні, выкарыстанні і папулярызацыі гістарычнай спадчыны Беларусі.
- Унёсак жанчын у развіццё сучаснай навукі, эканомікі, культуры і адукацыі.

**Формы ўдзелу ў канферэнцыі — вочная, завочная, анлайн, стэндавы даклад, відэадаклад. Працоўныя мовы — беларуская і руская.**

**Па выніках канферэнцыі плануецца выданне зборніка матэрыялаў.**

**Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору заявак на ўдзел у канферэнцыі, публікацыю матэрыялаў, не ўступае ў дыскусію адносна разгляду асобных тэкстаў і не дае даведак пра ход рэцэнзавання.**

Дасылаючы матэрыял для публікацыі, аўтар гарантуе дакладнасць усіх звестак пра сябе, адсутнасць формаў неправамернага запазычання ў артыкуле, належнае афармленне ўсіх запазычанняў тэксту, табліц, схем, ілюстрацый, а таксама дае згоду на апрацоўку персанальных звестак у аб’ёме, неабходным для падрыхтоўкі і правядзення канферэнцыі.

Аўтары артыкулаў нясуць поўную адказнасць за арыгінальнасць і дакладнасць дасланых матэрыялаў; адсутнасць спасылак на выданні і

электронныя рэсурсы, уключаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Аргкамітэт канферэнцыі пакідае за сабой права на рэдактарскія праўкі, якія не скажаюць асноўны змест артыкула.

## Парадак падачы матэрыялаў

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна да **24 красавіка 2026 г.** накіраваць у арганізацыйны камітэт заяўку (*гл. Дадатак 1*). У выніку станоўчага разгляду заяўкі арганізацыйны камітэт у тэрмін да 14 мая 2026 г. накіруе паведамленне і запрашэнне для ўдзелу ў мерапрыемстве. Даклады (патрабаванні *гл. Дадатак 2*) неабходна прадставіць да 1 верасня 2026 г.

**Праезд, пражыванне і іншыя выдаткі ўдзельнікаў — за кошт камандзіруючай арганізацыі.**

**Студэнтам для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна прадставіць водгук навуковага кіраўніка на даклад.**

**Заяўку і матэрыялы дасылаць у пазначаныя тэрміны на электронны адрас:** op@mail.narb.by.

## Кантакты

Пр-т Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, каб. 2022, аддзел публікацый ДУ «Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь»; электронная пошта: op@mail.narb.by.

Каардынатары канферэнцыі:
Калабаева Ульяна Анатольеўна (тэл. прац.: 8(017) 374 59 14);
Пецюкевіч Таццяна Уладзіміраўна (тэл. прац.: 8(017) 272 05 15).

*Дадатак 1*

**Заяўка на ўдзел у V Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Архіўны дыялог: Роля жанчын у навейшай гісторыі Беларусі»**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) | |
| 2. | Месца працы: пасада, падраздзяленне, поўнае найменне арганізацыі | |
| 3. | Вучоная ступень, званне | |
| 4. | E-mail, кантактны тэлефон | |
| 5. | Тэма даклада | |
| 6. | Форма ўдзелу: вочная / завочная / анлайн / стэндавы даклад / відэадаклад | |
| 7. | Неабходнасць тэхнічных сродкаў | |
| 8. | Пажаданні | |
| 9. | Запрашэнне на імя кіраўніка (калі неабходна, указаць кантактную інфармацыю: прозвішча, імя, імя па бацьку, пасаду кіраўніка, назву арганізацыі, электронны адрас) | |

*Дадатак 2*

## Правілы афармлення матэрыялаў

Файл у фармаце Microsoft Word (.doc, .docx, .rtf). Назва файла па форме: Прозвішча аўтара_Першыя два словы з назвы. Напрыклад: Новікаў_Крыніцазнаўчы патэнцыял.doc.

Гарнітура Times New Roman, кегль 12. Інтэрвал адзінарны. Выраўноўванне па шырыні. Палі: левае — 2 см, правае — 1,5 см, верхняе і ніжняе — 2 см. Водступ абзаца — 1 см.

Файл павінен утрымліваць наступныя кампаненты:

1) Імя, імя па бацьку, прозвішча — выраўноўванне па правым краі, курсіў.

2) Месца працы — выраўноўванне па правым краі, курсіў.

3) Праз радок назва артыкула — выраўноўванне па цэнтры, паўтлусты шрыфт, вялікія літары.

4) Праз радок асноўны тэкст артыкула аб’ёмам **да 20 тыс.** друкаваных знакаў, улічваючы прабелы, знакі прыпынку, лічбы, зноскі і інш.

5) Спіс крыніц і літаратуры афармляецца пасля асноўнага тэксту ў парадку з’яўлення спасылак на крыніцы ў тэксце артыкула згодна з патрабаваннямі ВАК ад 01.10.2024; https://vak.gov.by/node/8026. Спасылкі ў тэксце даюцца ў квадратных дужках [1, арк. 13].

6) Уся нятэкставая інфармацыя (фота, схемы і пад.) — асобным файлам у любым графічным фармаце (jpg, tiff; 300 dpi). Максімальная колькасць аб’ектаў нятэкставай інфармацыі — 5.

## Узор афармлення тэксту

*С.Я. Новікаў*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт замежных моў»*

**КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ НЯМЕЦКІХ ТРАФЕЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ НАРБ (НА МАТЭРЫЯЛАХ КАЛЕКЦЫІ «АЛЕКСАНДРЫЙСКІЯ МІКРАФІЛЬМЫ»)**

Сёння, калі ў нашай краіне набывае развіццё тэндэнцыя па актыўным увядзенні ў навуковы зварот новых дакументальных крыніц [1, арк. 13].